БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 947.6 “1941 / 1944” (043)

**НІКАЛАЕВА ІРЫНА УЛАДЗІМІРАЎНА**

# ЖАНЧЫНЫ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ГЕРМАНСКАЙ АКУПАЦЫІ (1941 – 1944 гг.)

07.00.02 – айчынная гісторыя

Аўтарэферат дысертацыі
на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

Мінск – 2006

Праца выканана ва ўстанове адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава”

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | доктар гістарычных навук, прафесар Космач Веніамін Аркадзьевіч, установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава”, кафедра ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры |
| Афіцыйныя апаненты: | доктар гістарычных навук, прафесар Іофе Эмануіл Рыгоравіч, установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”, кафедра паліталогіі і права |
| | кандыдат гістарычных навук, дацэнт Новікаў Сяргей Яўгенавіч, установа адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт”, кафедра гісторыі і беларусазнаўства |
| Апаніруючая арганізацыя: | Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт |

Абарона адбудзецца 18 мая 2006 г. у 14⁰⁰ гадзін на пасяджэнні савета Д 02.01.05 па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, ауд. 407.
Тэл. вучонага сакратара: 227-45-11.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы “17” красавіка 2006 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый,
доктар гістарычных навук,
дацэнт В.І. Менькоўскі

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Вялікая Айчынная вайна, як адна з ключавых падзей мінулага стагоддзя, застаецца важнай гістарыяграфічнай тэмай як у Беларусі, так і на ўсёй постсавецкай прасторы і за яе межамі. Апошняе дзесяцігоддзе адзначылася значнай актывізацыяй інтарэсу да ваеннай праблематыкі, што выклікана, па-першае, узрастаннем яе грамадскай актуальнасці ва ўмовах, калі ў шэрагу постсавецкіх дзяржаў намеціліся тэндэнцыі рэабілітацыі ідэалогіі фашызму і прадстаўлення ўдзельнікаў калабарацыйнага руху як ахвяр савецкага рэжыму і вайны, а таксама спробы ператварэння іх у нацыянальных герояў. Па-другое, узнікненне ў сусветнай гістарыяграфіі новых накірункаў, якія ідуць па шляху антрапалагічных распрацовак, стварыла дадатковыя магчымасці інтэрпрэтацыі ваеннай гісторыі. Зацвярджэнне ў сучасных даследаваннях антрапалагічнай парадыгмы вызначыла неабходнасць асэнсавання гісторыі мінулай вайны з пазіцыі вопыту разнастайных сацыяльна-дэмаграфічных груп. У гэтай сувязі ўяўляецца своечасовым вывучэнне становішча жанчын у экстрэмальных умовах ваеннага канфлікту, якое значна дапаўняе ранейшае бачанне гэтага перыяду айчыннай гісторыі, спрыяе больш глыбокаму яго разуменню.

Актуальнасць і неабходнасць аналізу ролі ваеннага фактару ў паўсядзённым жыцці беларускіх жанчын вызначаецца ўзрастаннем сёння даследчага інтарэсу да шматузроўневых і разнапланавых праблем, звязаных з усім спектрам узаемаадносін жанчын і грамадства, што выклікана заўважнымі зменамі ў іх сацыяльным статусе на працягу мінулага стагоддзя.

У гэтай сувязі рэтраспектыўны аналіз становішча жанчын ва ўмовах германскай акупацыі спрыяе фарміраванню цэльнага, сістэмнага, панарамнага ўспрыняцця гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама дазваляе прасачыць перадумовы, крыніцы і рэалізацыю жаночай эмансіпацыі пад уплывам ваеннага фактару. Актуальнасць працы вызначаецца адсутнасцю спецыяльнага даследавання па гісторыі жанчын у беларускім грамадстве перыяду 1941–1944 гг. Навукова-метадалагічны і тэарэтычны ўзровень развіцця сучаснай гістарыяграфіі патрабуе крытычнага пераасэнсавання традыцыйнага падыходу да тэмы “жанчына і вайна”, скіраванага на асвятленне выключна героіка-патрыятычных аспектаў жаночага ўдзелу ва ўсенароднай антыфашысцкай барацьбе, і вымагае вывучэння яе на фоне комплекснага аналізу: германскай акупацыйнай палітыкі і супраціўлення нацысцкаму рэжыму.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Даследаванне праводзілася ў рамках навуковага напрамку “Гісторыка-культурныя фактары станаўлення і развіцця чалавека і грамадства”. Тэма дысертацыі была зацверджана і затым скарэктавана на пасяджэннях Савета УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” (пратаколы № 5 ад 28.12.2001 г., № 7 ад 30.12.2005 г.).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэтай дысертацыйнай работы з'яўляецца навуковы аналіз асноўных накірункаў і вынікаў нацысцкай палітыкі ў адносінах да жаночага насельніцтва Беларусі і вызначэнне ролі і месца жанчын у антыфашысцкім супраціўленні на часова акупаванай тэрыторыі рэспублікі ў 1941–1944 гг. Для дасягнення дадзенай мэты ў даследаванні былі пастаўлены наступныя задачы:

- вызначыць асноўныя накірункі нацысцкай палітыкі ў адносінах да жаночага насельніцтва акупаванай тэрыторыі Беларусі;
- прааналізаваць дзейнасць германскіх акупацыйных улад па выкарыстанні працы жанчын Беларусі;
- ацаніць мерапрыемствы мясцовай акупацыйнай улады ў дачыненні да жаночага насельніцтва ў сацыяльнай сферы;
- вызначыць прадстаўніцтва жанчын у складзе падпольных арганізацый і партызанскіх фарміраванняў, кіруючых структур антыфашысцкага руху на захопленай тэрыторыі Беларусі;
- даследаваць дзейнасць падпольных органаў, партыйных і камсамольскіх арганізацый па ўключэнні жанчын у актыўную барацьбу з акупантамі;
- вызначыць асноўныя накірункі і формы ўдзелу жанчын Беларусі ў антыфашысцкім супраціўленні.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца гісторыя Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.). Прадмет даследавання – становішча жанчын рэспублікі на працягу адзначанага перыяду.

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалагічную аснову дысертацыі складаюць навуковыя прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці. Даследаванне ажыццяўлялася з прымяненнем гісторыка-генетычнага, гісторыка-параўнальнага і гісторыка-сістэмнага метадаў.

У рабоце выкарыстаны метад колькаснага аналізу, з дапамогай якога былі ацэнены якасныя характарыстыкі жаночага складу партызан. Для гэтага была абрана тэхналогія базы даных, прапанаваная А.Я. Паўлавай для аналізу асабовага складу партызанскіх фарміраванняў. Створаная на падставе імянных спісаў жаночага асабовага складу база даных апрацоўвалася з выкарыстаннем пакетаў электронных табліц Excel і СУБД Access. Для атрымання рэпрэзентатыўнага выніку была зроблена 10 % выбарка шляхам механічнага адбору адзінак для назірання, агульная колькасць якіх вызначалася ў адпаведнасці з табліцай дастаткова вялікіх лічбаў і склала 727. З імянных спісаў былі адабраны 290 запісаў аб удзельніцах партызанскай барацьбы па Мінскай вобласці, 264 – па Віцебскай і 173 – па Баранавіцкай. Для правядзення даследавання была абрана рэляцыйная структура базы даных, якая ўключыла 12 палёў (прозвішча-імя-імя па бацьку, год нараджэння, нацыянальнасць, партыйнасць, грамадзянская і ваенная адукацыя, адносіны да воінскай

службы, пасада да вайны, час і абставіны ўступлення ў партызанскі атрад, займаемая пасада, назва партызанскага фарміравання).

Для пацвярджэння гістарычнай дакладнасці атрыманых вынікаў былі выкарыстаны метады аналогіі, супрацьпастаўлення і параўнання.

**Навуковая навізна дысертацыі і значнасць атрыманых вынікаў.** Дадзеная праца з'яўляецца першым комплексным даследаваннем становішча жанчын Беларусі ў перыяд германскай акупацыі 1941–1944 гг. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі раскрыта сутнасць і вызначаны асаблівасці нацысцкай палітыкі ў дачыненні да жаночага насельніцтва Беларусі і даследавана яе практычная рэалізацыя акупацыйнымі органамі на захопленай тэрыторыі рэспублікі. Вывучана прадстаўніцтва жанчын у складзе падпольных груп і арганізацый, удакладнена іх колькасць сярод сакратароў і членаў падпольных камітэтаў КП(б)Б і ЛКСМБ. Створана электронная база даных асабовага жаночага складу партызанскіх атрадаў і брыгад, прааналізавана спецыфіка і дынаміка яго фарміравання, зроблена якасная характарыстыка паводле наступных паказчыкаў: узрост, нацыянальнасць, партыйнасць, сацыяльнае становішча да вайны, размеркаванне пасад у атрадах. Выяўлена спецыфіка дзейнасці партыйных, камсамольскіх камітэтаў і арганізацый сярод жаночага насельніцтва ў тыле ворага. На аснове значнага па аб'ёме новага фактычнага матэрыялу паказаны ўдзел жанчын ў розных формах антыфашысцкага супраціўлення на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Дысертацыйнае даследаванне выканана з прыцягненнем шырокага кола архіўных крыніц, якія да гэтага часу не ўводзіліся ў археаграфічны ўжытак і не вядомыя большай частцы навуковай грамадскасці.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Выкладзены ў дысертацыі матэрыял можа быць выкарыстаны ў працэсе далейшага правядзення фундаментальных даследаванняў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, стварэння абагульняючых прац па гісторыі беларускіх жанчын, а таксама пры распрацоўцы лекцыйных і спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі, падрыхтоўцы падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Нацыянал-сацыялістычны светапогляд германскага кіраўніцтва і стаўка на "маланкавую вайну" абумовілі адсутнасць напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны пэўнай стратэгічнай лініі ў адносінах да жанчын Беларусі. Асноўны разлік у дасягненні ваенна-палітычных мэт рабіўся на грубую сілу, масавы тэрор і татальную прапаганду. Пасля правалу "бліцкрыгу" германскае кіраўніцтва вымушана было звярнуцца да распрацоўкі планаў уключэння мясцовых жанчын у сферу ваенна-эканамічных і палітычных інтарэсаў трэцяга рэйха. Палітыка германскіх кіруючых колаў у адносінах да жаночага насельніцтва Беларусі характарызавалася максімальным выкарыстаннем жанчын у якасці крыніцы працоўных рэсурсаў, а таксама спробамі сацыяльнага манеўравання і схіленнем да калабарацыі.

2. Асноўным накірункам палітыкі германскіх улад у адносінах да жаночага насельніцтва акупаванай тэрыторыі Беларусі з'яўлялася яго выкарыстанне ў якасці працоўнага рэсурсу як для мясцовай, так і германскай вытворчасці. Адпаведная дзейнасць акупацыйных улад была абумоўлена станам развіцця падзей на савецка-германскім фронце, унутры эканамічнай сітуацыяй у рэйху і становішчам на рынку працы на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

3. Ва ўмовах зацяжной вайны германскія ўлады, не адмаўляючыся ад сілавых, знішчальных металаў у сваіх узаемаадносінах з насельніцтвам акупаваных абласцей, былі вымушаны поўным чынам упарадкоўваць грамадзянскае жыццё кантралюемых тэрыторый, праводзячы некаторыя мерапрыемствы ў дачыненні да мясцовых жанчын у сацыяльнай сферы, змест якіх вызначаўся агульнапалітычнымі задачамі акупацыйнага рэжыму, меў прагматычную накіраванасць і залежаў ад стану ваенных падзей і развіцця сітуацыі на акупаваных землях.

4. Жанчыны сталі актыўнымі ўдзельніцамі антыфашысцкага руху, які разгарнуўся на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Яны склалі значную частку радавых членаў падпольных арганізацый і партызанскіх фарміраванняў, былі прадстаўлены ў органах кіраўніцтва антыфашысцкай барацьбы.

5. У складаных умовах пачатковага перыяду вайны і акупацыі тэрыторыі Беларусі імкненне жанчын прыняць непасрэдны ўдзел у барацьбе з германскімі захопнікамі атрымала шырокую палітычную падтрымку. У савецкім тыле, непасрэдна ў партызанскіх атрадах і брыгадах разгарнулася вялікая работа па абучэнні добраахвотніц ваеннай справе. У сувязі са значным прытокам у партызанскі рух жанчын падпольнымі партыйнымі, камсамольскімі органамі, партызанскім кіраўніцтвам былі ўлічаны асаблівасці масава-палітычнай і выхаваўчай работы сярод іх.

6. Жанчыны Беларусі ўнеслі значны ўклад у разгортванне ў захопленых гітлераўцамі раёнах рэспублікі барацьбы супраць акупантаў, развіццё ўсіх яе відаў і форм.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Даследаванне з'яўляецца самастойнай аўтарскай працай. Дысертанткай была вывучана, сістэматызавана і прааналізавана значная колькасць апублікаваных і архіўных крыніц, створана база даных жанчын-удзельніц партызанскага руху, што дазволіла вызначыць месца і ролю жанчын ў антыфашысцкім супраціўленні на часова акупаванай тэрыторыі рэспублікі і ахарактарызаваць асноўныя накірункі, метады і наступствы нацысцкай палітыкі ў адносінах да жанчын Беларусі.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі выкладзены ў выступленнях на міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире" (Віцебск, 2002); V міжвузаўскай навукова-метадычнай канферэнцыі

маладых вучоных (Брэст, 2003); міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі “История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур” (Віцебск, 2003); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі” (Мінск, 2003); міжнародным навуковым семінары “Другая сусветная вайна: новыя аспекты даследаванняў” (Мінск, 2003); рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі “Вызваленне Беларусі ад германскіх акупантаў (восень 1943 – лета 1944 гг.)” (Мінск, 2004); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны” (Віцебск, 2004); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность” (Мінск, 2004); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Романовские чтения” (Магілёў, 2004); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Жанчыны ў Другой сусветнай вайне: гісторыя барацьбы і выжывання” (Мінск, 2005); міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі “Европа во второй мировой войне: история, уроки, современность” (Віцебск, 2005).

**Апублікаванасць вынікаў.** Вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 14 публікацыях, з іх 3 артыкулы ў навуковых часопісах, 2 - у зборніках навуковых работ, 9 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў – 66 старонак.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (339 назваў) і 10 дадаткаў. Поўны аб’ём дысертацыі – 140 старонак, у тым ліку бібліяграфія – 17 старонак, дадаткі – 24 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** даецца агульная ацэнка сучаснага стану навуковай праблемы, вызначаецца накірунак дысертацыйнага даследавання.

У першай главе **“Агляд літаратуры і крыніц па тэме”** прадстаўлены гістарыяграфічны аналіз публікацый па даследуемай праблеме, характарызуюцца крыніцы, якія склалі аснову дысертацыі.

У параграфе **“Гістарыяграфія праблемы”** зроблены навуковы агляд гістарычнай літаратуры па тэме даследавання. Вызначаюцца два асноўныя перыяды – савецкі і сучасны у асвятленні айчыннымі даследчыкамі становішча жанчын ва ўмовах германскай акупацыі 1941–1944 гг. Дадзены падзел абумоўлены зменамі ў падыходах да вывучэння ў цэлым гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама звязаны з пераменамі грамадска-палітычнага характару, якія адбыліся на прасторы былога СССР.

Прыярытэтным накірункам у вывучэнні жаночай праблематыкі ў першы перыяд стала тэма гераізму савецкіх жанчын у мінулай вайне. Атрымаўшы пэўнае адлюстраванне ў публікацыях ужо ў ваенны перыяд, яна знайшла свой працяг пераважна ў работах навукова-папулярнага

характару ў другой палове 40-х – 60-я гг.[1] Новы этап у вывучэнні тэмы звязаны са з'яўленнем у 70-80 гг. работ, у якіх былі зроблены спробы навуковага асэнсавання ролі патрыётак у антыфашысцкай барацьбе. Сярод іх трэба адзначыць падрыхтаваную на агульнасаюзным матэрыяле манаграфію В.С. Мурманцавай[2], дзе асобны раздзел прысвечаны патрыятычнай дзейнасці жанчын у тыле ворага. Вялікую ролю ў актывізацыі даследавання гісторыі жанчын Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны адыгралі рашэнні ААН аб абвяшчэнні 1975 г. Міжнародным годам жанчын, што супала з 30-годдзем заканчэння вайны. Праблемы ўдзелу жанчын рэспублікі ў мінулай вайне знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыях В. Протчанкі, Э. Языковіча, Р. Чарнаглазавай, В. Ваньшынай[3].

Асобныя аспекты барацьбы жанчын ва ўмовах акупацыі закраналіся айчыннымі даследчыкамі на працягу 40-80-х гг. у сувязі з работай над іншымі пытаннямі ваеннай гісторыі Беларусі. Сярод іх трэба адзначыць даследаванні Р.Ц. Аблавай, І.С. Краўчанкі, П.П. Ліпілы, Н.А. Якубоўскага, У.І. Лемяшонка і інш.[4] Каштоўная інфармацыя па тэме знайшла адлюстраванне ў многіх публікацыях разглядаемага перыяду, прысвечаных партызанскаму і падпольнаму руху ў асобных абласцях і раёнах рэспублікі[5]. Значны фактычны матэрыял пра становішча жанчын Беларусі ў перыяд вайны прадстаўлены ў калектыўных працах, падрыхтаваных Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, Інстытутам гісторыі

---

[1] Захаревич П.Б., Бучинская К.В. Советская женщина в Великой Отечественной войне. Аннот. указ. литературы / Гос. б-ка СССР им. В.И. Ленина). – М., 1944. – 35 с., Карасева Л.Е. Славные дочери нашей Родины. – М.: Госполитиздат 1946. – 63 с.; Савіцкая Я. Савецкая жанчына ў Вялікай Айчыннай вайне // Бальшавік Беларусі. – 1946. – № 3. – С. 54–61; Героини войны. Очерки о женщинах – Героях Советского Союза / Сост. А. Белановский П. Перепеченко. – М.: Госполитиздат, 1963. – 719 с. і інш.

[2] Мурманцева В.С. Советские женщины в Великой Отечественной войне: 1941–1945. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Мысль, 1979. – 292 с.

[3] Протченко В.З. Боевой подвиг Белорусских партизанок (1941–1945 гг.) // Вопросы истории КПСС: Межвед. сб. – Минск, 1976. – Вып.7. – С. 59–68, Языковіч Э.Ф. Жанчыны Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1976. – № 2. – С. 17–22; Черноглазова Р. Женщины Белоруссии в Великой Отечественной войне // В борьбе и труде: Сб. / Под ред. Г.Т. Дмитриевой и В.И. Белявцева. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск, 1977. – С. 217–243; Ваньшина В.И. Ратный подвиг советских женщин в годы Великой Отечественной войны: (Материал в помощь лектору) / Правл. о-ва "Знание" БССР. – Минск, 1989. – 19 с.

[4] Аблова Р.Т. Это было в Белоруссии. (Из истории борьбы молодежи в партизанских отрядах и подполье). – М.: Молодая гвардия, 1957. – 192 с.; Липило П.П. КПБ – организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. – Минск: Госиздат БССР, 1959. – 259 с.; Якубовский Н.А. В тыл врага: (Помощь страны кадрами партизанскому движению Белоруссии в годы Великой Отеч. войны). – Минск: Беларусь, 1979. – 175 с.; Лемешонок В.И. Идейно-политическая работа Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. – Минск: Беларусь, 1988. – 221 с. і інш.

[5] О партийном подполье в Минске в годы Великой Отечественной войны. – Минск: Госиздат БССР, 1961. – 90 с.; Климов И., Граков Н. Партизаны Вилейщины. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск: Беларусь, 1970. – 382 с.; Пахомов Н.И., Дорофеенко Н.И., Дорофеенко Н.В. Витебское подполье. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск: Беларусь, 1974. – 248 с.; Подвиги их бессмертны: О подпол. борьбе сов. людей в захвач. фашист. оккупантами городах и селах Белоруссии в годы Великой Отеч. войны (1941–1944): Сб. ст. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; Под ред. С.З Почанина. – Минск: Беларусь, 1978. – 383 с.

АН БССР[6], у энцыклапедычным выданні “Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941–1945”[7]. Пэўную цікавасць уяўляюць успаміны непасрэдных удзельнікаў падзей[8].

Такім чынам, у работах першага перыяду шырокае адлюстраванне атрымаў патрыятычны рух жанчын рэспублікі супраць германскіх агрэсараў. Разам з тым, назапашаная факталогія не атрымала неабходнага аналітычнага асэнсавання. Увага гісторыкаў толькі да аднаго аспекту жыцця жанчын ва ўмовах акупацыі, звязанага з іх удзелам у супрацьстаянні ворагу, не дазволіла аб’ектыўна і поўна паказаць месца і ролю жаночага насельніцтва ў складаных ваенна-палітычных і эканамічных працэсах, што адбываліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Найноўшы этап у вывучэнні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пачаўся ў 1990-я гады і азнаменаваўся ўвядзеннем у навуковы ўжытак недаступных раней крыніц, выкарыстаннем новых метадалагічных падыходаў у асвятленні традыцыйных для савецкай гістарыяграфіі праблем, пашырэннем ваеннай тэматыкі. Тым не менш, праблема становішча жанчын Беларусі ў 1941–1944 гг. не стала прадметам самастойнага даследавання, у той час як некаторыя яе аспекты знайшлі сваё адлюстраванне ў кантэксце аналізу асобных пытанняў акупацыі і супраціўлення.

Раскрыццю праблемы садзейнічалі работы, прысвечаныя даследаванню гісторыі асобных груп беларускага насельніцтва ва ўмовах германскай акупацыі. Значны інтарэс ўяўляюць працы А.А. Кавалені, аб’ектам усебаковага вывучэння якога з’яўляецца дзейнасць моладзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны[9], манаграфічныя даследаванні У.І. Кузьменкі, прысвечаныя

---

[6] Гісторыя Беларускай ССР. У 5-ці т. / Акад. Навук БССР. Ін-т гісторыі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972 1975 – Т. 4: Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.) / Рэдкал.: І.М. Ігнаценка (старшыня) і інш. – 1975. – 640 с.; Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: В 3 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; Гл. редкол. А.Т. Кузьмин (пред.) и др. – Минск: Беларусь, 1983–1985. – Т. 1: 1941–1942. – 1983. – 591 с.; Т. 2: 1943. – 1984. – 551 с.; Т. 3: 1943–1944. – 1985. – 531 с.

[7] Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: Энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл., Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1990. – 680 с.

[8] В принеманских лесах: Воспоминания партизан и подпольщиков / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; Редкол.: Е.Е. Емельянова и др. – Минск: Беларусь, 1975. – 319 с.; Жилянин Я.А., Позняков И.Б., Лузгин В.И. Без линии фронта. – Минск, 1975. – 320 с.; За край родной: Воспоминания партизан и подпольщиков Баранов. обл. / Сост. А.И. Залесский, А.Ф. Хацкевич, С.И. Портасенок и др. – Минск: Беларусь, 1978. – 286 с.; Мазаник Е.Г. Возмездие: Докум. повесть / Лит. запись А. Кейзарова – Минск: Маст. літ., 1981. – 174 с.; Савицкая Я.М. Бойцы подпольного фронта. – Минск: Беларусь, 1982. – 175 с.; Партийное подполье в Белоруссии, 1941–1944: Мин. обл. и Минск: Страницы воспоминаний / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; АН БССР. Ин-т истории, Редкол.: В.Е. Лобанок (гл. ред.) и др. – Минск: Беларусь, 1984. – 367 с. і інш.

[9] Каваленя А.А. Падрыхтоўка партызанскай моладзі да ўзброенай барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі // Старонкі ваеннай гісторыі Беларусі: Зб. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Аддз. ваен. гіст., Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка, Каф. айчын. і сусвет. гісторыі; Навук. рэд. А.М. Літвін. – Мінск: БДПУ, 1998. – Вып. 2. – С. 157–171; Каваленя А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1999. – 260 с.

разнастайным аспектам становішча інтэлігенцыі на захопленай тэрыторыі[10]. Звесткі пра спецыфіку сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і прававога становішча жанчын яўрэйскай нацыянальнасці, іх удзеле ва ўсенародным супрацьстаянні захопнікам утрымліваюцца ў працах Э.Р. Іофе, Я.С. Розенблата, І.Э. Яленскай[11].

Некаторыя аспекты палітыкі германскіх улад у дачыненні да жаночага насельніцтва Беларусі закраналіся пры разглядзе асобных праблем акупацыйнага рэжыму. Пытанні працоўнага выкарыстання жаночага насельніцтва ўзнімалі такія даследчыкі, як С.Я. Новікаў, Я.А. Грэбень[12]. Матэрыял пра прымусовую мабілізацыю беларускіх жанчын у Германію ўтрымліваецца ў гісторыка-аналітычным даследаванні "Белорусские остарбайтеры"[13]. Удзел жанчын у калабарацыі дапамагаюць асвятліць работы А.К. Салаўёва, І.Ю. Сервачынскага[14]. Праблема сацыяльнага манеўравання акупантаў ва ўмовах зацяжной вайны і пытанні паўсядзённага выжывання насельніцтва на часова захопленай тэрыторыі знайшлі адлюстраванне ў публікацыях І.Э. Яленскай, А.В. Бяляева і інш[15]. Мерапрыемствы германскай акупацыйнай адміністрацыі па прыцягненні да супрацоўніцтва мясцовых жыхароў разглядаліся ў даследаваннях С.У. Жумара, Г.А. Болсун, А.А. Мігуновай, М.Г. Жылінскага[16].

---

[10] Кузьменко В.И. Интеллигенция Беларуси в период немецко-фашистской оккупации (1941–1944 гг.). – Минск: БГПУ, 2001. – 199 с.

[11] Иоффе Э.Г. Катастрофа белорусского еврейства // Иоффе Э.Г. Страницы истории евреев Белоруссии: Крат науч.-попул. очерк / Евр. Ун-т в Минске. – Минск: ПКФ "АРТИ-ФЕКС", 1996. – С. 107–162; Иоффе Э.Г. Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941–1945. – Минск, 2003. – 428 с.; Розенблат Е., Еленская И. Пинские евреи, 1939–1944. – Брест: БрГУ, 1997. – 312 с.; Розенблат Е.С. Нацистская политика геноцида в отношении еврейского населения на территории западных областей Беларуси (1941-1944 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 1999. – 18 с.

[12] Новікаў С.Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941–1944 гг. (агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў). – Мінск: МДЛУ, 2002. – 219 с.; Новікаў С.Я. Беларусь ў кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі другой сусветнай вайны. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 223 с.; Гребень Е.А. Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941 – 1944 гг.): Автореф. дис. ...канд. ист. наук: 07.00.02 / БГУ. – Минск, 2005. – 19 с.

[13] Белорусские остарбайтеры: ист.-аналит. исслед. / Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко, Н.А. Бондаренко, В.Д. Селеменев: Под ред. Г.Д. Кнатько – Минск: НАРБ, 2001. – 336 с.

[14] Соловьёв А.К. Белорусская Центральная Рада: создание, деятельность, крах / Под ред. С.М. Симонова. – Минск: Навука і тэхніка, 1995. – 176 с.; Сервачинский И.Ю. Коллаборационизм на оккупированной территории Беларуси (июль 1941 – август 1944 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / БГУ. – Минск, 1999. – 16 с.

[15] Еленская И.Э. К вопросу о продовольственном снабжении и социальной помощи населению Брестчины в годы оккупации (источниковедческий анализ документов ГАБО) // Старонкі ваеннай гісторыі Беларусі: Зб. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Аддз. ваен. гіст., Бел. дзярж. пед ун-т імя М. Танка, Каф. айчын. і сусвет. гісторыі; Навук. рэд. А.М. Літвін. – Мінск: БДПУ, 1998. – Вып. 2. – С. 115–132; Беляев А.В. Медико-санитарные и социальные мероприятия местной оккупационной администрации в Беларуси (194–1944 гг.) // 55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы: Матэрыялы навук.-тэарэт. канф., 4–5 мая 2000 г.: У 2 ч. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2000. – Ч. 1. – С. 94–97.

[16] Жумарь С.В. Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны. – Минск: БелНИИДАД, 1996. – 283 с.; Болсун Г.А. Противостояние немецкой и советской пропаганды на оккупированной территории Беларуси (1941–1944 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Бел. гос. ун-т. – Минск, 1999. – 20 с.; Мігунова А.А. Прапагандысцкая і культурна-асветніцкая дзейнасць нямецкай акупацыйнай улады ў генеральнай акрузе Беларусь (1941–1944): Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / Бел. дзярж. пед. ун-т ім. М. Танка. – Мінск, 1999. – 24 с.; Жылінскі М.Г.

Назапашванню гістарычных ведаў па праблеме супраціўлення акупацыйнаму рэжыму з боку жаночага насельніцтва Беларусі садзейнічалі работы сучасных айчынных даследчыкаў, прысвечаныя асобным пытанням патрыятычнай барацьбы ў тыле ворага. У гэтай сувязі асаблівай увагі заслугоўвае дысертацыйнае даследаванне Л.Я. Паўлавай. Аўтар упершыню паспрабаваў прааналізаваць занатаваную ў імянных спісах сацыядэмаграфічную інфармацыю пра баявы склад жанчын-партызанак[17]. Аднак крыніцазнаўча-метадалагічная накіраванасць працы і выбар у якасці прадмета даследавання асабовага складу партызанскіх фарміраванняў у цэлым не дазволілі зрабіць гэта больш дэталёва. Навуковаму асэнсаванню становішча жанчына ва ўмовах акупацыі садзейнічалі абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі перыяду вайны такіх беларускіх даследчыкаў, як У.К. Коршук, А.М. Літвін, А.А. Каваленя і інш.[18] Каштоўны матэрыял па праблеме ўтрымліваюць кнігі гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць"[19].

Разам з айчыннымі гісторыкамі пэўны ўклад у асвятленне становішча жанчын Беларусі ва ўмовах акупацыйнага рэжыму ўнеслі нямецкія гісторыкі Н. Мюлер, Х. Ленхард, Б. К'яры[20], польскі даследчык Ю. Туронак[21]. Да навуковага асэнсавання некаторых пытанняў акрэсленай тэмы звярталіся таксама аўтары беларускай эміграцыі[22]. У шэрагу работ замежных аўтараў знайшлі адлюстраванне пэўныя пытанні ўдзелу жанчын у антыфашысцкім супраціўленні на акупаванай тэрыторыі Беларусі[23].

Падводзячы вынік аналізу літаратуры па праблеме даследавання, можна канстатаваць, што фрагментарнае адлюстраванне атрымалі толькі асобныя яе аспекты. Становішча жанчын ва ўмовах акупацыі як асобная,

---

Адукацыя на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 ліпень 1944 гг.): Аўтарэф. дыс. ...канд. гіст. навук: 07.00.02 / БДПУ імя М. Танка. - Мінск, 2002. - 21 с.

[17] Павлова Е.Я. Личный состав партизанских формирований Беларуси в годы Великой Отечественной войны (1941-1944 гг.): источники и методы исследования: Автореф. дис. ...канд. ист. наук: 07.00.09 / БГУ. - Минск, 2003. - 20 с.

[18] Коршук У.К. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск: БелЭн, 2000. С. 180-190; Літвін А.М. Акупацыя Беларусі (1941-1944): пытанні супраціву і калабарацыі. - Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. 288 с.; Коваленя А.А. Беларусь 1939 - 1945 гг. Война и политика. - Минск: Веды, 2001. - 204 с.

[19] Памяць: Гіст.-дак. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. - Мінск, 1985-2005.

[20] Мюллер Н. Вермахт и оккупация (1941-1944). Пер. с нем. А. Артемова, А. Долгорукова, И. Карабутенко, Ю. Чупрова, Г. Шевченко. Под. ред. А. Юденкова. М.: Воениздат, 1974. - 387 с.; Ленхард Хартмут "Жизненное пространство на Востоке". Немцы в Белоруссии 1941-1944 / Предисл. А. Кудравца. Послесл., подгот. текста и примеч. А. Литвина // Неман. - 1993. № 5. - С. 119-160; К'яры Б. Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941-1944 г.) / Пер. з ням. Л. Баршчэўскага; Нав. рэд. Г. Сагановіч. Мінск, 2005. - 390 с.

[21] Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Пер. з польск. В. Ждановіч, Камент. А.М. Літвіна Мінск: Беларусь, 1993. - 236 с.

[22] Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: Папуляр. нарыс з гісторыі Беларусі - Мінск: Навука і тэхніка, 1993. - 414 с.; Юрэвіч Л. Вырваныя бачыны. Да гісторыі Саюзу Беларускае Моладзі. - Мінск Энцыклапедыкс, 2001. - 214 с.

[23] Erickson John Soviet Women at War // Garrard John. Garrard Corol eds. World War 2 and the Soviet People. N.Y.: St. Martin's Press, 1993. P. 50-76; Тэк Н. У партизан: судьба женщин // Женщины на краю Европы / Под. ред. Е. Гаповой - Минск: ЕГУ, 2003. С. 168-187; Эпштэйн Б. Женщины в сопротивлении Минского гетто // Женщины на краю Европы / Под. ред. Е. Гаповой. - Минск: ЕГУ, 2003. С. 188-207.

самастойная праблема застаецца практычна па-за ўвагай як айчынных, так і замежных гісторыкаў, накладваючыся на іншыя тэмы ў вывучэнні ваеннага перыяду беларускай гісторыі.

У параграфе **"Крыніцы даследавання"** адзначаецца, што аснову працы склалі архіўныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўных архівах Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей і адрозніваюцца тэматычнай разнастайнасцю. Сярод іх вылучаюцца, па-першае, дакументы, якія характарызуюць сацыяльна-эканамічныя і ідэалагічныя аспекты нацысцкай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, дзейнасць германскіх улад у адносінах да жанчын; па-другое, матэрыялы, якія раскрываюць работу партыйных і камсамольскіх органаў і арганізацый сярод жаночага насельніцтва ў тыле ворага, а таксама адлюстроўваюць удзел жанчын у антыфашысцкім супраціўленні. Першы комплекс крыніц уключае ў сябе справаводную дакументацыю органаў акупацыйнага кіравання: генеральных, акруговых і гарадскіх камісарыятаў, гарадскіх, раённых і валасных упраўленняў, якая пераважна ўтрымліваецца ў фондах абласных архіваў, а таксама матэрыялы, змешчаныя ў адпаведных фондах НАРБ, складзеныя на падставе аператыўных даных савецкіх груп, органаў НКУС, партызан і падпольшчыкаў, што асвятляюць сацыяльна-эканамічную і рэпрэсіўную палітыку акупацыйных улад у адносінах да жаночага насельніцтва. Другі тэматычны блок крыніц складаюць дакументы савецкага паходжання па гісторыі антыфашысцкай барацьбы на Беларусі – гэта матэрыялы БШПР, ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, мясцовых партыйных і камсамольскіх камітэтаў, падпольных груп і арганізацый.

Важнай крыніцай даследавання сталі апублікаваныя тэматычныя зборнікі дакументаў і матэрыялаў, даведнікі аб арганізацыйнай структуры партыйнага і камсамольскага падполля, аб партызанскіх фарміраваннях, якія дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі рэспублікі. Сярод выкарыстаных у даследаванні трэба адзначыць крыніцы асабістага паходжання, сабраныя ў фондах Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны. Аўтарам былі вывучаны таксама матэрыялы перыядычнага акупацыйнага друку.

У другой главе **"Акупацыйная палітыка германскіх улад у адносінах да жаночага насельніцтва на захопленай тэрыторыі Беларусі"** аналізуюцца галоўныя накірункі нацысцкай палітыкі ў дачыненні да жанчын.

У першым параграфе **"Асноўныя напрамкі дзейнасці германскіх акупантаў у дачыненні да жанчын"** вызначаецца характар нацысцкай акупацыйнай палітыкі і метады яе ажыццяўлення на часова захопленай тэрыторыі, раскрываецца сутнасць палітычнай лініі германскага кіраўніцтва ў адносінах да жаночага насельніцтва Беларусі. Прынцыповай асновай для яе практычнай рэалізацыі павінны былі стаць метады масавага тэрору і татальнай прапаганды ў дачыненні да ўсяго, ва ўяўленнях нацыстаў, "ніжэйшага" ў расавых адносінах насельніцтва акупаваных абласцей. Пры гэтым нацысцкія стратэгі напярэдадні ваеннай кампаніі, зместам якой

павінна была стаць “вайна на знішчэнне”, не бралі пад увагу пол жыхароў акупаваных тэрыторый, што вызначыла адсутнасць акрэсленай палітыкі ў адносінах да жанчын. К 1942 г. пад уплывам параз нямецкіх войск на Усходнім фронце погляды германскага кіраўніцтва на месца і значэнне жаночага насельніцтва ў рэалізацыі акупацыйнай палітыкі пэўным чынам змяніліся. У новых палітычных абставінах нацысты не маглі не прыняць пад увагу той факт, што ў выніку праведзенай эвакуацыі ў савецкі тыл, мабілізацыі мужчын у Чырвоную Армію, а таксама ўключэння значнай іх часткі ў партызанскую барацьбу большасць дарослага насельніцтва акупаваных тэрыторый складалі жанчыны. Яны пачалі разглядацца ў якасці аднаго з непасрэдных аб’ектаў у ажыццяўленні ваенна-палітычных планаў трэцяга рэйха адносна ўсходніх акупаваных тэрыторый. Накіроўваць і кантраляваць работу сярод жаночага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі прызваны былі жаночыя аддзелы, створаныя пры кіруючых структурах Усходняга міністэрства і на розных узроўнях акупацыйнай адміністрацыі.

Асноўным зместам нацысцкай палітыкі ў дачыненні да жанчын Беларусі стала максімальнае іх выкарыстанне ў якасці крыніцы працоўных рэсурсаў, прызначаных для прымусовага вывазу на работу ў Германію і эксплуатацыі ў інтарэсах нямецкай ваеннай эканомікі ў межах рэспублікі. Крах плана “Барбароса” і пераўтварэнне вайны з “маланкавай” у зацяжную паставілі гітлераўцаў перад неабходнасцю ажыццяўлення пэўных мерапрыемстваў па ўладкаванні сацыяльнага жыцця на заваяваных землях, якія б падтрымлівалі на мінімальным узроўні жыццяздольнасць рабочай сілы і адначасова спрыялі стварэнню ва ўяўленні мясцовага насельніцтва прыхільнага вобраза новай улады. Для ідэалагічнага забеспячэння палітыкі акупантаў была разгорнута актыўная прапагандысцкая апрацоўка жаночага насельніцтва. Сумесна з калабарантамі германскія ўлады зрабілі спробы стварэння на акупаванай тэрыторыі жаночых арганізацый, якія б цесна супрацоўнічалі з органамі мясцовага кіравання. Інспіраванае фашыстамі стварэнне ў маі 1942 г. Усебеларускага жаночага камітэта (УЖК) не знайшло падтрымкі сярод асноўнай часткі жаночага насельніцтва. Большасць жанчын і дзяўчат не толькі свядома ўхіляліся ад членства ў калабарацыйных арганізацыях, бо ўспрымалі ўдзел у іх як супрацоўніцтва з захопнікамі, але станавіліся актыўнымі ўдзельніцамі антыфашысцкага супраціўлення.

У другім параграфе **“Выкарыстанне працы жаночага насельніцтва ў вытворчасці і на прымусовых работах”** аналізуецца дзейнасць акупацыйнай адміністрацыі, накіраваная на эксплуатацыю працы жанчын Беларусі. Даследуецца механізм рэгістрацыі працаздольнага жаночага насельніцтва, маштаб, формы і ўмовы выкарыстання іх працы акупантамі.

Палітыка ў сферы выкарыстання працы мясцовых жанчын была звязана са станам развіцця падзей на савецка-германскім фронце, унутрыэканамічнай сітуацыяй у рэйху і становішчам на рынку працы на акупаванай тэрыторыі. На першым этапе гэтай палітыкі (1941 – першая

палова 1942 г.) жаночай працоўнай сіле адводзілася дапаможная роля ў функцыянаванні ствараемых гаспадарчых структур, якія забяспечвалі патрэбнасці вермахта і мясцовага грамадзянскага кіраўніцтва. Працоўнай павіннасцю былі ахоплены галоўным чынам жанчыны, якія да вайны ўжо працавалі па якой-небудзь спецыяльнасці. Тыя з іх, якія мелі на выхаванні дзяцей, а таксама цяжарныя, разглядаліся як непрацаздольныя і спачатку ўвогуле вызваляліся ад абавязку рэгістравацца на біржах працы. Другі этап (другая палова 1942 – першая палова 1943 гг.) характарызуецца пашырэннем практыкі выкарыстання працы жаночага насельніцтва ў мясцовай вытворчасці і на прымусовых работах. Ва ўмовах дэфіцыту рабочай сілы, звязанага з масавай вярбоўкай насельніцтва Беларусі на работы ў рэйх, а таксама аднаўленнем мясцовай вытворчасці для ўключэння яе ў сістэму эканамічнага забеспячэння Германіі і яе ўзброеных сіл, пачынаецца прыцягненне жанчын да работ, якія раней выконваліся мужчынамі. З мэтай папаўнення працоўных рэсурсаў пачалася абавязковая рэгістрацыя хатніх гаспадынь, якія мелі на выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту. Трэці этап (другая палова 1943–1944 гг.) звязаны з максімальнай эксплуатацыяй жаночых працоўных рэсурсаў у інтарэсах ваеннай эканомікі фашысцкай Германіі. Да гэтага часу рэзерв мужчынскай рабочай сілы быў амаль цалкам выкарыстаны, што абумовіла татальны ахоп жаночай працоўнай сілы, якая была задзейнічана як на акупаванай тэрыторыі, галоўным чынам у аператыўным тыле, так і у рэйху. Германскія ўлады, якія з ідэалагічных меркаванняў абмяжоўвалі прыцягненне нямецкіх жанчын да працы ў прамысловасці, разам з тым шырока праводзілі вярбоўку і выкарыстанне ў ваеннай эканоміцы Германіі жанчын з акупаванай тэрыторыі Беларусі, апошнія склалі 59,6 % ад усіх беларускіх остарбайтэраў.

Трэці параграф **"Мерапрыемствы германскіх акупацыйных улад у адносінах да жанчын у сацыяльнай сферы"** прысвечаны праблемам арганізацыі харчовага забеспячэння, медыцынскага абслугоўвання і дзейнасці акупацыйнай адміністрацыі ў галіне сацыяльнай падтрымкі жанчын. Першапачаткова нацысцкае кіраўніцтва лічыла непатрэбным ажыццяўленне нават мінімальных мер па ўладкаванні сацыяльнага жыцця ненямецкага насельніцтва на заваяваных землях. Аднак ва ўмовах неспрыяльнага для нацыстаў ваенна-палітычнага развіцця падзей германскія ўлады вымушаны былі пайсці на кампраміс паміж ідэалагічнымі поглядамі і прагматычнымі меркаваннямі. Зацікаўленасць акупантаў у захаванні працаздольнасці працоўнай сілы і неабходнасць падтрымання санітарна-эпідэмічнага парадку ў тыле нямецкай арміі абумовілі правядзенне адпаведных мерапрыемстваў па харчовым забеспячэнні і медыцынскім абслугоўванні насельніцтва заваяваных абласцей, у тым ліку жанчын. Імкненне германскіх улад кантраляваць рэпрадуктыўную сферу і папярэджваць распаўсюджванне венерычных захворванняў сярод асабовага складу войска вызначыла арганізацыю акушэрска-гінекалагічнай дапамогі

для мясцовых жанчын. Але медыцынскае абслугоўванне было платным і нават для працуючых жанчын уяўлялася недаступным.

Рост патрэбнасцей у рабочай сіле падштурхнуў акупацыйныя ўлады да ўсталявання асобага парадку рэгулявання працоўнага дня для жанчын-маці, стварэння пры найбольш значных прадпрыемствах дзіцячых садоў, а таксама ўвядзення той меры льгот, якая была неабходная для спалучэння цяжарнасці і прафесійнай занятасці. Такая практыка павінна была забяспечыць умовы масавага прыцягнення жанчын у вытворчасць і адначасова служыла прапагандысцкім мэтам акупантаў, якія прадстаўлялі адпаведныя мерапрыемствы як накіраваныя на ахову мацярынства і клопат пра дзяцей заваяваных абласцей. Увогуле яна насіла абмежаваны і выбіральны характар (прыярытэт мелі фольксдойчэ, а таксама асобы, пэўным чынам карысныя для Германіі) і не магла аказаць рэальнай падтрымкі асноўнай часткі жанчын, якія павінны былі сумяшчаць мацярынства з вытворчай працай, каб хоць як-небудзь забяспечыць існаванне сябе і дзяцей.

У трэцяй главе **"Супраціўленне германскім акупацыйным уладам з боку жаночага насельніцтва"** разглядаецца ўдзел жанчын у антыфашысцкай барацьбе на часова захопленай тэрыторыі Беларусі.

У першым параграфе **"Жанчыны ў складзе падпольных арганізацый і партызанскіх фарміраванняў, кіруючых структур антыфашысцкага руху"** даследуецца жаночае прадстаўніцтва ў ліку арганізатараў супраціўлення акупантам, патрыятычным падполлі, асабовым і каманда-палітычным складзе партызан. Акупацыйная палітыка, жорсткі рэжым, усталяваны на захопленай тэрыторыі, сталі адным з фактараў, які спрыяў росту антыфашысцкага супраціўлення, важнейшымі формамі якога з'явіліся партызанскі рух і падпольная барацьба. Стварэнне першых нелегальных груп ужо летам-восенню 1941 г. адбывалася пры актыўным удзеле жанчын, якія адначасова ўзначалілі значную іх частку і ў далейшым мелі сур'ёзнае прадстаўніцтва ў падпольных арганізацыях. На іх долю прыходзілася 48 % ад членаў нелегальных арганізацый і груп, якія дзейнічалі ў 1943 г. у Мінску, 42 % ад усіх падпольшчыкаў Віцебска, больш за 35 % ад удзельнікаў гомельскага падполля. Падлікі, якія датычацца шэрагу груп і арганізацый, сведчаць, што сярод падпольшчыц пераважалі маладыя жанчыны ад 20 да 30 год, большасць удзельніц з'яўляліся беларускамі і былі беспартыйнымі, на долю камсамолак прыходзілася да 40 % патрыётак. Жанчыны склалі значную частку сярод кіраўнікоў падпольных партыйных і камсамольскіх органаў. На адпаведных пасадах у камсамольскіх камітэтах у розныя часы знаходзілася больш за 200 дзяўчат. Членамі партыйных абкамаў, гаркамаў і райкамаў Беларусі з'яўлялася 29, сакратарамі – 6 жанчын. Як правіла, усе яны былі занятыя на кіруючай рабоце напярэдадні вайны.

Дастойнае месца занялі жанчыны ў партызанскім руху. Статыстычныя даныя БШПР, распрацаваныя на 282,5 тыс. партызан, сведчаць пра ўдзел у партызанскай барацьбе (з улікам агентурных разведчыкаў, сувязных, тых, хто

загінуў, трапіў у палон і прапаў без вестак) 45 242 жанчын ці 16 % ад усіх партызан. Сярод асабовага складу атрадаў і брыгад, якія прадставілі спісачную справаздачнасць на дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, жанчыны складалі 7,8 %. Аналіз паказаў, што жаночае насельніцтва пачало актыўна далучацца да партызанскай барацьбы з другой паловы 1942 г. Асноўная частка жанчын уступіла ў атрады ў 1943–1944 гг., прычым больш за палову з іх сталі партызанкамі з ліпеня 1943 г. да пачатку 1944 г., што было звязана з ростам партызанскага руху ў цэлым і абумоўлена шэрагам прычын. Сярод іх, па-першае, агульны пад'ём арганізацыйнай работы партыйных падпольных органаў сярод жаночага насельніцтва ў тыле ворага; па-другое, значнае пашырэнне з другой паловы 1943 г. нацысцкай практыкі прымусовай мабілізацыі мясцовых жанчын на работы ў рэйх, што стала адным з фактараў, які спрыяў росту жаночых партызанскіх сіл. Вывучэнне асабовага складу партызанскіх фарміраванняў сведчыць, што жанчыны былі актыўнымі ўдзельніцамі партызанскай барацьбы як ва ўсходніх, так і заходніх абласцях Беларусі. Яны не толькі з'яўляліся радавымі байцамі, але займалі таксама пасады камісараў брыгад і атрадаў, іх намочнікаў па камсамолу, ажыццяўлялі аператыўную работу ў якасці начальнікаў штабоў партызанскіх фарміраванняў. Большасць сярод партызанак складалі жанчыны маладога ўзросту: на долю дзяўчат, якія на момант уступлення ў атрад не дасягнулі 26-гадовага ўзросту, прыходзілася звыш 70 % партызанак. Тры чвэрці патрыётак былі беларускамі. Сярод прадстаўніц іншых нацыянальнасцяў галоўнае месца належала рускім і яўрэйкам. Прыкладна трэць партызанак з'яўлялася членамі ВЛКСМ, аднак большасць жанчын былі беспартыйнымі. У той жа час, сярод прадстаўніц каманднa-начальніцкага складу ўдзельная вага камуністак і камсамолак дасягала каля 80 %, радавымі байцамі былі ўсяго крыху больш за 6 % членаў партыі. Атрыманыя звесткі пра пасады, якія займалі партызанкі да вайны, сведчаць пра ўдзел у партызанскім руху прадстаўніц усіх сацыяльных слаёў.

У другім параграфе **"Падбор, падрыхтоўка і выхаванне жаночых кадраў для барацьбы ў тыле ворага"** аналізуецца дзейнасць партыйных органаў па ўцягненні жанчын у актыўнае супраціўленне захопнікам. Работа па падборы кадраў з ліку жанчын для дзейнасці ў тыле праціўніка і мэтанакіраваная іх падрыхтоўка пачала праводзіцца ўжо летам 1941 г. Важнай формай ваеннага абучэння жанчын стала арганізацыя спецыяльных школ і кароткатэрміновых курсаў у савецкім тыле, аднак у тых абставінах яны не маглі забяспечыць падрыхтоўку ўсіх уступаўшых у рады партызан беларускіх патрыётак. Апошнія авалодвалі ваеннымі спецыяльнасцямі непасрэдна ў партызанскіх фарміраваннях. Характар ваеннай падрыхтоўкі жанчын вызначаўся з улікам канкрэтных умоў, у якіх знаходзіліся партызаны, і залежаў ад патрэбы ў адпаведных партызанскіх кадрах. У сувязі са значным прытокам жанчын у рады беларускіх партызан надавалася вялікая ўвага ўключэнню іх непасрэдна ва ўзброеную барацьбу.

Пра эфектыўнасць гэтай работы сведчыць практыка стварэння ў партызанскіх атрадах асобных жаночых аддзяленняў і ўзводаў.

Далучэнне да партызанскага руху значнай колькасці жанчын выклікала неабходнасць улічваць спецыфіку выхаваўчай работы сярод іх. Кіраўніцтва гэтай работай належала КП(б)Б і было жорстка цэнтралізаваным. Падпольныя камітэты, камісары партызанскіх фарміраванняў, іх намеснікі па камсамольскай рабоце павінны былі штомесячна планаваць канкрэтныя мерапрыемствы сярод жаночай часткі асабовага складу. З мэтай павышэння эфектыўнасці выхаваўчай работы сярод жанчын і аказання ім паўсядзённай дапамогі ў атрадах і брыгадах ствараліся жаночыя арганізацыі. Шырокае распаўсюджанне з 1943 г. атрымалі нарады і пасяджэнні партызанак.

У трэцім параграфе **"Асноўныя накірункі і формы супраціўлення жанчын акупацыйнаму рэжыму"** характарызуецца ўдзел жаночага насельніцтва ў барацьбе супраць захопнікаў. Раскрываюцца наступныя асноўныя накірункі дзейнасці жанчын: 1) агітацыйна-прапагандысцкая работа сярод насельніцтва акупаванай тэрыторыі і партызан; 2) баявая дзейнасць у складзе патрыятычнага падполля і партызанскіх фарміраванняў; 3) дзейнасць, накіраваная на падтрыманне жыццяздольнасці антыфашысцкага руху (арганізацыя матэрыяльнага забеспячэння, бытавога і медыцынскага абслугоўвання); 4) сабатаж ваенна-палітычных і эканамічных мерапрыемстваў праціўніка. Адзначаецца, што спецыфіка барацьбы на акупаванай тэрыторыі, дзе жанчыны выклікалі значна меншае падазрэнне, чым мужчыны, абумовіла камплектаванне пераважна з ліку жаночага насельніцтва адпаведных кадраў для прапагандысцкай работы ў тыле ворага, вызначыла высокае прадстаўніцтва жанчын у складзе разведпадраздзяленняў партызанскіх фарміраванняў, сярод агентурных разведчыкаў (70 %) і партызанскіх сувязных (каля 62 %), а таксама гаспадынь канспіратыўных кватэр. Адным з галоўных накірункаў удзелу жанчын у антыфашысцкім супраціўленні з'яўлялася дзейнасць па ўмацаванні жыццядзейнасці партызан у форме іх бытавога і медыцынскага абслугоўвання.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праведзенае даследаванне дае падставы зрабіць наступныя вывады:

1. Германскія ўлады напярэдадні ваеннай кампаніі супраць СССР, зместам якой павінна была стаць "вайна на знішчэнне", не разглядалі жаночае насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў якасці самастойнага аб'екта будучай акупацыйнай палітыкі. Асноўны разлік у дасягненні ваенна-палітычных мэт, сфармуляваных правадырамі трэцяга рэйха ў планах "Ост" і "Барбароса", рабіўся на грубую сілу ў дачыненні да ўсяго "ніжэйшага" ў расавых адносінах насельніцтва акупаваных абласцей, незалежна ад яго полу і ўзросту. К 1942 г. пад уплывам параз нямецкіх войск на Усходнім фронце і ператварэння вайны з "маланкавай" у зацяжную германскае кіраўніцтва

вымушана было звярнуцца да распрацоўкі планаў прыцягнення беларускіх жанчын, якія складалі асноўную частку дарослага насельніцтва падпарадкаваных тэрыторый, да супрацоўніцтва з акупацыйным рэжымам як у эканамічнай, так і палітычнай сферах. Аднак карэкціроўкі, унесеныя нацысцкімі лідэрамі ў адпаведную палітыку, мелі вымушаны характар і не змянілі яе злачынную сутнасць, якая прасочваецца з пачатку акупацыі і да яе завяршэння і будуецца на выкарыстанні сілавых метадаў ва ўзаемаадносінах з жаночым насельніцтвам захопленых абласцей [2; 4; 7; 8].

2. Прымусовы вываз жанчын рэспублікі на работу ў Германію, як і прыцягненне да працы ў інтарэсах нямецкай ваеннай эканомікі ў межах тэрыторыі Беларусі, сталі для германскіх улад адным з галоўных прынцыпаў рэалізацыі акупацыйнай палітыкі ў дачыненні да гэтай катэгорыі насельніцтва захопленых абласцей. Дзейнасць акупантаў па выкарыстанні працы мясцовых жанчын была абумоўлена развіццём падзей на савецка-германскім фронце, унутрыэканамічнай сітуацыяй у рэйху, становішчам на рынку працы на акупаванай тэрыторыі і характарызавалася максімальнай эксплуатацыяй жаночых працоўных рэсурсаў [2; 4; 7; 8].

3. Сацыяльныя мерапрыемствы акупацыйнай адміністрацыі насілі прагматычны характар і былі абумоўлены ў першую чаргу імкненнем германскіх улад забяспечыць працаздольнасць прыдатнага да эксплуатацыі жаночага насельніцтва, што вызначыла адпаведную арганізацыю іх харчовага забеспячэння, медыцынскага абслугоўвання, а таксама стварэнне пэўных умоў, неабходных для спалучэння мацярынства і працоўнай занятасці. Уведзеныя акупантамі мінімальныя харчовыя нормы не маглі забяспечыць нармальнае існаванне жаночага насельніцтва, якое было пастаўлена ў жорсткія ўмовы выжывання. Увага акупантаў да медыцынскага абслугоўвання жыхароў заваяваных абласцей, у тым ліку жанчын, была звязана з неабходнасцю падтрымання санітарна-эпідэмічнага парадку ў тыле нямецкай арміі. Мерапрыемствы акупацыйнай адміністрацыі ў галіне аховы здароўя жанчын былі накіраваны ў першую чаргу на арганізацыю акушэрска-гінекалагічнай дапамогі, што было выклікана імкненнем германскіх улад кантраляваць рэпрадуктыўную сферу і папярэджваць распаўсюджванне венерычных захворванняў сярод асабовага складу войска на тэрыторыі Беларусі. Непаслядоўная дзейнасць акупацыйнай адміністрацыі ў сацыяльнай сферы была абумоўлена ўсё большай неабходнасцю масавага выкарыстання жаночай працоўнай сілы і падпарадкавана таксама прапагандысцкім мэтам, а таму насіла эпізадычны і выбіральны характар і не здольная была палепшыць становішча асноўнай часткі жанчын [4; 8].

4. Жанчыны Беларусі нараўне з мужчынамі выступілі арганізатарамі супраціўлення акупантам і сталі актыўнымі ўдзельнікамі антыфашысцкай барацьбы, якая разгарнулася на часова акупаванай тэрыторыі. Яны склалі значную частку членаў падпольных арганізацый і асабовага складу партызанскіх фарміраванняў, былі прадстаўлены ў органах кіраўніцтва

антыфашысцкай барацьбой – у нелегальных органах КП(б)Б і асабліва ЛКСМБ, антыфашысцкіх камітэтах, у каманднa-начальніцкім складзе партызанскіх фарміраванняў. Атрыманыя ў ходзе даследавання звесткі сведчаць пра малады ўзрост асноўнай часткі партызанак і падпольшчыц, сярод якіх колькасна пераважалі беларускі. Большасць патрыётак з'яўляліся беспартыйнымі, тады як сярод жанчын, прадстаўленых у кіруючых структурах падпольнай і партызанскай барацьбы, пераважалі камуністкі і камсамолкі. Супраць германскіх захопнікаў выступілі прадстаўніцы самых разнастайных сацыяльных груп насельніцтва, што пацвярджае агульнапрынятьі тэзіс пра ўсенародны характар антыфашысцкай барацьбы [5; 6; 11; 12; 13; 14].

5. Авалоданне жаночым насельніцтвам рэспублікі ваеннай справай у межах абаронна-масавых мерапрыемстваў на працягу двух перадваенных дзесяцігоддзяў вызначыла магчымасць паўнапраўнага ўключэння добраахвотніц ва ўзброеную абарону Айчыны. У савецкім тыле, непасрэдна на акупаванай тэрыторыі, у партызанскіх атрадах і брыгадах, разгарнулася вялікая работа па абучэнні жанчын ваеннай справе. Важную ролю ў падборы патрыётак для дзейнасці ў тыле ворага і арганізацыі ваеннага абучэння жанчын адыгралі падпольныя партыйныя і камсамольскія камітэты рэспублікі. У сувязі са значным прытокам у партызанскі рух жанчын партыйнымі і камсамольскімі органамі, партызанскім кіраўніцтвам былі ўлічаны і асаблівасці выхаваўчай работы сярод іх, што вызначыла не толькі дыферэнцыраваны падыход у масава-палітычнай рабоце, але і пошук спецыфічных арганізацыйных форм і метадаў уздзеяння, сярод якіх – нарады і пасяджэнні жаночага актыву партызанскіх фарміраванняў, а таксама стварэнне жаночых арганізацый у атрадах і брыгадах [3; 9; 11; 12; 13].

6. Жанчыны Беларусі ўнеслі значны ўклад у разгортванне супраціўлення акупацыйнаму рэжыму на тэрыторыі рэспублікі, развіццё ўсіх яго накірункаў і форм. Беларускія патрыёткі прынялі актыўны ўдзел у правядзенні ў захопленых гітлераўцамі раёнах рэспублікі антыфашысцкай агітацыйна-масавай, прапагандысцкай работы, праявілі гераізм і мужнасць ва ўзброенай барацьбе ў складзе партызан і патрыятычнага падполля. Прадстаўніцы жаночага насельніцтва, якія дзейнічалі ў цеснай сувязі з народнымі мсціўцамі, і тыя, хто змагаўся ў іх радах, актыўна спрыялі зрыву ваенна-эканамічных і палітычных планаў германскага фашызму і адыгралі выключную ролю ва ўмацаванні жыццяздольнасці паўстанцкага руху. Вывучэнне жаночых кадраў партызанскіх фарміраванняў сведчыць пра задзейнічанне асноўнай часткі жанчын у страявой службе і паказвае на занятасць на гаспадарчых пасадах ў атрадах і брыгадах менш за 10 % агульнай колькасці ўдзельніц партызанскага руху. Пры гэтым амаль усе радавыя партызанкі сумяшчалі баявую дзейнасць з выкананнем даручэнняў па гаспадарча-бытавым абслугоўванні партызанскіх лагераў, якое ва ўмовах партызанскай вайны мела не меншае значэнне [1; 10; 11; 12; 13].

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


Артыкулы ў часопісах

1. Нікалаева І.У. Савецкая гістарыяграфія становішча жанчын Беларусі ва ўмовах Вялікай Айчынная вайны // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2004. – № 1. – С. 23–27.
2. Нікалаева І.У. Выкарыстанне нямецкімі акупантамі працы жаночага насельніцтва Беларусі ў мясцовай вытворчасці і на прымусовых работах (1941–1944 гг.) // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2005. – № 2. – С. 14–18.
3. Нікалаева І.У. Падрыхтоўка жаночых кадраў для партызанскай і падпольнай барацьбы (1941–1944 гг.) // Веснік Брэсцкага універсітэта. – 2005. – № 2. – С. 33–37.

Публікацыі ў зборніках навуковых артыкулаў

4. Николаева И.В. Политика немецких оккупационных властей в Беларуси в отношении женского населения (1941–1944 гг.) // Женщины в истории: возможность быть увиденными: Сб. науч. ст. / Под ред. И.Р. Чикаловой. – Минск: БГПУ им. Максима Танка, 2004. Вып. 3. – С. 255–268.
5. Нікалаева І.У. Жанчыны ў асабовым складзе партызанскіх фарміраванняў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны // Романовские чтения: сб. трудов Международной науч. конференции / Под ред. О.В. Дьяченко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 88–90.

Матэрыялы канферэнцый

6. Нікалаева І.У. Жанчыны Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны: да пастаноўкі праблемы // Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: Материалы международной научно-теоретической конференции, 31 октября – 1 ноября 2002 г.: В 2 ч. / УО "Витебский госуниверситет им. П.М. Машерова"; Ред. кол.: Космач В.А. (гл. ред.), Яковлева Г.Н., Русецкий А.В. и др. – Витебск: Издательство ВГУ им. П.М. Машерова, 2002. – Ч. 2. – С. 83–84.
7. Нікалаева І.У. Дзейнасць акупацыйнай адміністрацыі па выкарыстанні працы мясцовых жанчын на тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.) // V межвузовская науч.-метод. конф. молодых ученых, 29–30 мая 2003 г.: Сб. материалов: В 2 ч.; Под общ. ред. А.А. Горбацкого – Брест: Изд-во БрГУ им. А.С. Пушкина, 2003. – Ч. 1. – С. 181–182.

## РЭЗЮМЭ

Нікалаева Ірына Уладзіміраўна

**Жанчыны Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (1941 – 1944 гг.)**

**Ключавыя словы:** акупацыйны рэжым, прымусовая праца, сацыяльная сфера, антыфашысцкае супраціўленне, партызанкі, падпольшчыцы.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца гісторыя Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 гг.) Прадмет даследавання – становішча жанчын рэспублікі на працягу адзначанага перыяду.

**Мэтай даследавання** з'яўляецца навуковы аналіз асноўных накірункаў і вынікаў нацысцкай палітыкі ў адносінах да жаночага насельніцтва Беларусі і вызначэнне ролі і месца жанчын у антыфашысцкім супраціўленні на часова акупаванай тэрыторыі рэспублікі ў 1941–1944 гг.

**Метадалагічную** аснову дысертацыі складаюць навуковыя прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці. Даследаванне ажыццяўлялася з прымяненнем гісторыка-генетычнага, гісторыка-параўнальнага і гісторыка-сістэмнага метадаў, таксама ў рабоце выкарыстаны метад колькаснага аналізу.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Упершыню праведзена комплекснае даследаванне становішча жанчын Беларусі ў перыяд германскай акупацыі 1941–1944 гг. Раскрыта сутнасць і вызначаны асаблівасці нацысцкай палітыкі ў дачыненні жаночага насельніцтва Беларусі і даследавана яе практычная рэалізацыя акупацыйнымі органамі. Вывучана прадстаўніцтва жанчын у складзе падпольных груп і арганізацый, удакладнена іх колькасць сярод сакратароў і членаў падпольных камітэтаў КП(б)Б і ЛКСМБ. Створана электронная база даных асабовага жаночага складу партызанскіх атрадаў і брыгад, прааналізавана спецыфіка і дынаміка яго фарміравання, зроблена якасная характарыстыка па шэрагу паказчыкаў: узрост, нацыянальнасць, партыйнасць, сацыяльнае становішча да вайны, размеркаванне пасад у атрадах. Выяўлена спецыфіка дзейнасці партыйных, камсамольскіх камітэтаў і арганізацый сярод жаночага насельніцтва ў тыле ворага.

**Вынікі дысертацыйнага даследавання** маюць навуковае і практычнае значэнне. Выкладзены ў дысертацыі матэрыял можа быць выкарыстаны ў працэсе далейшага правядзення фундаментальных даследаванняў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, стварэння абагульняючых прац па гісторыі беларускіх жанчын, а таксама пры распрацоўцы лекцыйных курсаў па гісторыі Беларусі і спецкурсаў, падрыхтоўцы падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

**РЕЗЮМЕ**

Николаева Ирина Владимировна

**Женщины Беларуси в период германской оккупации (1941 – 1944 гг.)**

**Ключевые слова:** оккупационный режим, принудительный труд, социальная сфера, антифашистское сопротивление, партизанки, подпольщицы.

**Объектом исследования** является история Беларуси в период германской оккупации (июнь 1941 – июль 1944 гг.). **Предмет исследования** – положение женщин республики на протяжении отмеченного периода.

**Целью исследования** является научный анализ основных направлений и результатов нацистской политики в отношении женского населения Беларуси и определение роли и места женщин в антифашистском сопротивлении на временно оккупированной территории республики в 1941 – 1944 гг.

**Методологическую** основу диссертации составляют научные принципы историзма, объективности и системности. Исследование осуществлялось с применением историко-генетического, историко-сравнительного и историко-системного методов, также в работе использован метод количественного анализа.

**Научная новизна и значимость полученных результатов.** Впервые проведено комплексное исследование положения женщин Беларуси в период германской оккупации 1941–1944 гг. Раскрыта сущность и определены особенности нацистской политики в отношении женского населения Беларуси и исследована ее практическая реализация оккупационными органами. Изучено представительство женщин в составе подпольных групп и организаций, уточнено их количество среди секретарей и членов подпольных комитетов КП(б)Б и ЛКСМБ. Создана электронная база данных личного женского состава партизанских отрядов и бригад, проанализирована специфика и динамика его формирования, сделана качественная характеристика по ряду показателей: возраст, национальность, партийность, социальное положение до войны, распределение должностей в отрядах. Выявлена специфика деятельности партийных, комсомольских комитетов и организаций среди женского населения в тылу врага.

**Результаты диссертационного исследования** имеют научное и практическое значение. Изложенный в диссертации материал может быть использован в процессе дальнейшего проведения фундаментальных исследований по истории Великой Отечественной войны, создания обобщающих работ по истории белорусских женщин, а также при разработке лекционных курсов по истории Беларуси и спецкурсов, подготовке учебников и учебных пособий.

## SUMMARY

Nikolaeva Irina Vladimirovna

Women of Belarus During the German Occupation (1941–1944)

**Key words:** occupation regime, forced labour, social sphere, antifascist resistance, partisans, undergrounders.

**The object of the research** is the history of Belarus during the German occupation (June 1941 – July 1944). **The subject of the research** is the situation of the women of the republic during that period.

**The purpose of the research** is the scientific analysis of the basic directions and results of Nazi policy concerning the female population of Belarus and the determination the role and the place of the women in antifascist resistance on the temporary occupation territory of the republic in 1941–1944.

**The methodological basis** of the thesis is scientific principles of historicism, objectivity and system method. Such methods as historico-genetic, historico-comparative and historico-system-defined and the method of the quantitative analysis are used.

**The scientific novelty and the importance of the obtained results.** It is the first complex research of the situation of the Bellorussian women during the German occupation 1941–1944. The essence and the features of Nazi policy concerning the female population of Belarus are determined and its practical realization occupation organs is investigated. The representation of the women in the structure of the underground groups and organizations is investigated, the amount of the women being the secretaries and members of the underground party and comsomol committees is defined. The electronic database of personal female membership of partisan groups and brigades is developed; the specificity and the dynamics of its formation is analysed; the qualitative characteristic on a number of parameters is made: age, nationality, party membership, social status before the war, distribution of the posts in the groups. The specificity of the activity of the party, comsomol committees and organizations among the female population in the rear of the enemy is revealed.

**The results of the research** have scientific and practical value. The material can be used for further realization of basic researches on a history of Great Patriotic War, the composing of generalizing works on the history of the Byelorussian women, and also for the development of lecture courses on the history of Belarus and special courses, preparation of the textbooks and manuals.

